РАШЭННЕ ГРОДЗЕНСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ
26 верасня 2024 г. № 65

# Аб заснаванні штогадовай прэміі імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям

На падставе падпункта 1.2[1] пункта 1 артыкула 19 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 108-З «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь» Гродзенскі раённы Савет дэпутатаў РАШЫЎ:

1. Заснаваць штогадовую прэмію імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям.
2. Зацвердзіць Палажэнне аб штогадовай прэміі імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям (дадаецца).
3. Апублікаваць (абнародаваць) дадзенае рашэнне ў газеце «Перспектыва».
4. Дадзенае рашэнне ўступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Старшыня** **І.У.Лябецкі**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Рашэнне
Гродзенскага раённага
Савета дэпутатаў
26.09.2024 № 65

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб штогадовай прэміі імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак прысуджэння штогадовай прэміі імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям (далей – прэмія).
2. Прэмія засноўваецца ў мэтах маральнага і матэрыяльнага стымулявання інтэлектуальнай дзейнасці, заахвочвання да высокіх вынікаў вучэбнай працы, выражэння грамадскага прызнання дасягненняў вучняў.
3. Прэмія прысуджаецца адораным, таленавітым вучням устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Гродзенскага раёна, якія дасягнулі поспехаў у інтэлектуальнай, творчай, мастацкай дзейнасці, праявілі сябе ў даследчай рабоце, у спорце, паказалі высокія вынікі вучэбнай працы, прызёрам абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, аглядаў, выстаў, алімпіяд.
4. Прэмія прысуджаецца рашэннем Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў адзін раз у год на падставе прадстаўлення камісіі па назначэнні прэміі імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям, персанальны склад якой устанаўліваецца распараджэннем старшыні Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта.
5. Устанаўліваецца 15 прэмій у год у памеры 10 базавых велічынь кожная.
6. Установы агульнай сярэдняй адукацыі Гродзенскага раёна штогадова ў тэрмін да 10 красавіка прадстаўляюць у камісію па назначэнні прэміі імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям звесткі аб прэтэндэнтах на прысуджэнне прэміі па форме згодна з дадаткам, копіі дакументаў, якія пацвярджаюць высокія дасягненні вучняў, пісьмовую згоду на апрацоўку персанальных даных аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняга.

Персанальная адказнасць за сапраўднасць прадстаўленай інфармацыі ўскладваецца на кіраўніка ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі.

7. Пры прысуджэнні прэміі ўлічваюцца:

дасягненні прэтэндэнта на прэмію ў інтэлектуальнай, творчай і мастацкай дзейнасці, даследчай рабоце;

вынікі ўдзелу ў абласных, рэспубліканскіх, міжнародных прадметных алімпіядах, конкурсах, аглядах і выставах;

вынікі вучэбнай дзейнасці;

паводзіны.

8. Выплата прэмій вучням праводзіцца за кошт сродкаў раённага бюджэта, прадугледжаных на адукацыю.

9. Уручэнне прэмій праводзіцца на ўрачыстым мерапрыемстве «Апошні званок» прадстаўнікамі Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта, Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў. Інфармацыя аб выніках уручэння прэмій размяшчаецца на афіцыйных інтэрнэт-сайтах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, упраўлення адукацыі Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта, газеце «Перспектыва».

Дадатак
да Палажэння
аб штогадовай прэміі
імя Героя Беларусі
Віталія Ільіча Крэмко
асоба адораным дзецям

Дадатак

**Звесткі аб прэтэндэнце на прысуджэнне штогадовай прэміі імя Героя Беларусі Віталія Ільіча Крэмко асоба адораным дзецям**

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (калі ёсць) прэтэндэнта ______________________________
_________________________________________________________________
2. Дата, месяц, год нараджэння ______________________________________________
3. Установа адукацыі, у якой навучаецца прэтэндэнт _________________________________
_________________________________________________________________
4. Клас, у якім вучыцца прэтэндэнт _________________________________________
5. Дасягненні прэтэндэнта ў інтэлектуальнай, творчай, мастацкай дзейнасці, вынікі даследчай работы ______________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
6. Характарыстыка прэтэндэнта ______________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________

Дырэктар установы адукацыі ______________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку (калі ёсць)

М.П.